# Беларускі тэатр.

У пятніцу, 13 лютага, ў гарадзкім тэатры будзе пастаўлено: „Антось Лата“, Тараса Гушчы і „Птушка шчасьця“, сцэнічны абразок у 2 акт. са сьпевамі.

Каб даць магчымасьць шырокім масам беларускага грамадзянства бываць у тэатры, дырэкцыя наладжывае рад агульна-даступных дзённых спэктакляў па даступнай цане. Білеты на гэтые спэктаклі будуць ад 1 да 10 мар. Першы агульна даступны спэктакль адбудзецца ў нядзелю, 15 лютага а 1 гадз. папоўд. Будуць іграць: „Бутрым Няміра“, гістар. драма Ф. Аляхновіча у 2 акт. з пролёгам і „Міхалка“, жарт у 1 акце Далецкіх.